Жыві, Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№ 223 (236) 16 лістапада 1991 г. Субота.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

Факты Аргументы Коммен-тарии Суждения

Герои 12-го года могут вернуться?

В Столбцах демонтирован памятник Ленину.

Как сообщили в горсовете, это не политическая акция, а вынужденная мера.

Дело в том, что под покровом темноты местными «борцами» у скульптурной фигуры был отбит нос. Памятник отправили на реставрацию в Минск, После он, возможно, будет возвращен на прежнее место. А может... Ведь ранее на этом постаменте находилась скульптура героев Отечественной войны 1812 года.

Сергей ГОЛОВКО.

Ну и «адвокатов» у адвокатов!

Утром 13 ноября в минском следственном изоляторе № 1 содержащиеся там под стражей объявили голодовку. Продлилась она, впрочем, недолго — после обеда акция протеста прекращена.

Как сообщили нам в стачкоме адвокатов, голодовка была объявлена в поддержку требований этой категории юристов.

Забастовка адвокатов тем временем продолжается. Все еще трудно предсказать, приведет ли эта акция к выполнению их требований. По сведениям «Агентства «БелаПАН», в стачком звонят судьи и сообщают фамилии адвокатов, не желающих участвовать в забастовке. В знак солидарности? Это еще как сказать...

«Автокомандировка»

ГОМЕЛЬ. **Всякому, кто интересуется руководителем здешнего автомагазина, отвечают: «Директор в командировке».**

«Командировку» Владимиру Атрощенко «выписали» в следственный изолятор сотрудники республиканской прокуратуры. Туда же отправилась и товаровед Тамара Иванчикова, у которой на квартире обнаружен домашний магазинчик автозапчастей и японские телевизоры.

Когда вернутся на работу незадачливые «предприниматели», покажет следствие. И вернутся ли...

Анатолий ГОТОВЧИЦ.

Внука спасти не удалось

В Борисове в деревянном доме сгорел пятилетний малыш.

Из-за чего произошел пожар, сейчас выясняется. Огонь охватил дом почти мгновенно. Отец с сыном, которые были внутри, не успели выскочить. И только благодаря тому, что рядом жила бабушка, одну жизнь удалось спасти. Из огня она почти неживого вытащила своего сына, внук же к тому времени уже задохнулся от дыма...

Виктор АНАТОЛЬЕВ.

На их полки хорошо класть наши зубы

На выставке итальянской мебели, которая проходит в Минском Дворце спорта, начинается оформление заявок на приглянувшиеся экспонаты.

По словам представителя фирмы «Новый проспект» Григория Еремеева, приглядывались нашим согражданам чаще всего спаленка за 960 долларов из США и бар за 1370 единиц той же валюты. По подсчетам Еремеева, примерно 20—25 частных лиц, не задаваясь вопросами о том, чем можно заполнить такой большой бар и спокойно ли спать на валютной кровати, придут во Дворец спорта с намерением оформить заявку.

Кстати, те, кому сейчас долларов не хватает даже на итальянскую полку для обуви, могут не отчаиваться: выставка из Минска уезжать не собирается. Она, напротив, имеет перспективы перерасти в магазин.

Ирина ДЕРГАЧ.

Без шила не поставят мыла?

УШАЧИ. **К тому, что купить банку сока без обмена на пустую стеклотару невозможно, горожане привыкли давно. Теперь привыкают к еще одному новшеству.**

Купить лоток яиц можно здесь, лишь сдав две пустые банки. Райзаготпром таким образом собирает тару, без которой ему не поставят тушенку.

Ольга КОРОЛЕНКО.

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов

Вкратце

✦ В Ново-Огарево под председательством Президента СССР М. Горбачева состоялось заседание Государственного совета СССР. Был рассмотрен проект договора о Союзе суверенных государств, доработанный с учетом замечаний республик. Отмечалось, что проект приведен в соответствие с нынешними общественно-политическими реалиями и отвечает интересам суверенных государств.

✦ Социал-демократия Республики Польша не получала какой-либо материальной помощи ни от КПСС, ни из других иностранных источников. Это заявление сделали президиум Главного совета и Центральный исполнительный комитет СДРП.

✦ С понедельника, 18 ноября, на всей территории Грузии рабочий день будет начинаться на час раньше. Это решение принято с целью максимального использования светлого времени суток, а также экономии энергетических ресурсов.

✦ Как сообщили из МИД СССР, 18—20 ноября в Москве состоится второй раунд переговоров представителей семи ведущих западных стран и суверенных республик по проблеме советской внешней задолженности. На этот раз предстоит обсудить вопросы обслуживания долга страны до конца нынешнего года, а также оказания СССР гуманитарной помощи.

Сижу за решеткой... Осенев

Об отсутствии людской благодарности, о порядках в тюрьме и о любви говорит в стихах, сочиненных в камере, бывший Председатель Верховного Совета СССР Анатолий Лукьянов.

Его поэтические произведения под литературным псевдонимом Осенев опубликованы в последнем номере еженедельника «День», учрежденного Союзом писателей РСФСР и называющего себя газетой «духовной оппозиции».

«День» утверждает, что стихи Лукьянова в будущем встанут в один ряд с тюремной поэзией Василия Стуса, Юрия Гацланскова и Юлия Даниэля.

(ТАСС).



Рисунок Олега ПОПОВА.

Стачкомов больше нет. Будут Свободные профсоюзы

МИНСК. **Сегодня в 9 часов утра открывается учредительный съезд Свободных профсоюзов Беларуси.**

Делегаты-стачкомовцы из всех областных и других промышленных центров республики должны будут утвердить устав и выбрать руководящие органы Свободных профсоюзов Республики Беларусь. Затем будет подана заявка в Минюст РБ на регистрацию новой организации.

По словам сопредседателя минского стачкома Георгия Мухина, удалось выработать проект устава, в основу которого заложен опыт мирового профсоюзного движения, в частности, польской «Солидарности». Свободные профсоюзы РБ не будут идти на конфронтацию с Федерацией профсоюзов и вступают в качественно новый этап — конкурентной борьбы. Граждане Беларуси будут иметь право выбора: кому доверить защиту своих интересов.

Юрий НОЯРОВИЧ.

В 6 раз уменьшаются затраты на периферию благодаря СП «Ньюбридж системз»

ТОЛЬКО 1 ПРИНТЕР И ТОЛЬКО 1 МОДЕМ ПОНАДОБЯТСЯ ДЛЯ 6 КОМПЬЮТЕРОВ, ЕСЛИ ОНИ ОБЪЕДИНЕНЫ ЛОКАЛЬНОЙ СЕТЬЮ «Main Street» КАНАДСКОГО ПРОИЗВОДСТВА.

* Одновременно вы становитесь обладателем защищенной электронной системы для мгновенного информационного обмена.
* Соединение компьютеров и периферии в локальную сеть «Main Street» производится через стандартные порты этих устройств с дополнительной защитой портов.
* Простота работы с «Main Street» впечатляет: за 3—4 часа вы освоите эту надежную информационную сеть, которую мы установим вам под «ключ».
* Сегодня наша сеть доступна всем. Средства, сэкономленные от применения сети «Main Street»» канадской фирмы «Newbridge Networks Corporation», многократно превышают затраты на ее приобретение.

УБЕДИТЕСЬ В ЭТОМ САМИ, ДЕМОНСТРАЦИОННЫЙ ЗАЛ «НЬЮБРИДЖ СИСТЕМЗ» ЖДЕТ ВАС. АНСЕШ

Тел. для справок в Минске (8-0172) 29-39-84.

На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Будзе і ў нас ваенны міністр...

Толькі ці вырашацца ваенныя праблемы?

Учарашні дзень у Вярхоўным Савеце быў, калі можна так сказаць, ваенным. У гасцявых ложах пабольшала запрошаных генералаў і палкоўнікаў. Старшыня пастаяннай камісіі Мечыслаў Грыб дакладваў дэпутатам прапановы аб стварэнні міністэрства па справах абароны. Са стварэннем нацыянальнай гвардыі, на думку камісіі, спяшацца пакуль што няма патрэбы.

Вельмі гарачыя спрэчкі ўспыхнулі вакол назвы будучага міністэрства. Адны віталі прапанаваны варыянт, другія настойвалі на звыклай для нашых вушэй назве — міністэрства абароны. Справа, канешне, не ў стылістычных нюансах. Зерне ісціны было відавочным. Апазіцыя і тыя, хто падтрымлівае іх, змагаюцца за незалежнасць Беларусі. Зянон Пазьняк у адным са шматлікіх выступленняў катэгарычна заявіў, што Рэспубліка Беларусь не валодае ні адным крытэрыем суверэннай дзяржавы.

Для другіх няма нічога іншага, акрамя старой дарогі: да будучага толькі ў цесных абдымках Саюза пад кіраўніцтвам Масквы.

Трэція лічылі грошы, называлі бюджэт худым, дзіравым. Навошта ж яшчэ ўзвальваць на свае плечы і траты на войска? Аляксандр Лукашэнка апераваў лічбамі бюджэту на будучы год.

Наогул, на першы погляд да аналізу будучых расходаў і расходаў па бягучаму году падыход быў не лепшым. Напрыклад, нечакана ў якасці эканамічнага эксперта выступіў Іван Каратчэня. Ён абвінаваціў апазіцыю ў мане. Уладзімір Заблоцкі прыводзіў дадзеныя саюзнага міністэрства фінансаў. Прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч назваў даведку сурагатам. Аляксандр Лукашэнка дабываў праект бюджэту самастойным шляхам...

Ці можна ў такім гармідары стала ацаніць, узважыць, што пагражае нам з вамі, нашым кішэням? Па-мойму, не.

Ішоў турнір, скрыжоўваліся мячы, сыпаліся іскры... Калі б тая назва міністэрства была ў выглядзе металічнай бляшанкі, то яе ад доўгай дыскусіі адшліфавалі б да бляску. Хаця сама па сабе назва (тая альбо іншая) яшчэ не вырашае ніводнай праблемы.

Іх жа мноства. Па даных, што гучалі на сесіі, у Беларусі зараз размяшчаюцца 180 тысяч вайскоўцаў, у перспектыве — прыбаўка часцей, што пакінуць Германію і Польшчу... У ваенных казармах і гарадках жывуць нашы з вамі суайчыннікі, як зусім маладыя хлопцы, так і сталыя мужчыны. Горка, але немагчыма не паўтарыць тыя словы, што сказала маці салдата з трыбуны сесіі: «Зараз лепш папасці ў турму, чым у армію».

Пра гэта гаварыў і палкоўнік, дэпутат Валерый Паўлаў, задаючы пытанні накшталт таго, дык што афіцэрам — танкі разгружаць, салдатам — за зброю, каб вырашыць уласныя цяжкасці? А цяжкасці ёсць. Салдаты рвуць на істужкі прасціны, каб падшываць падкаўнерыкі.

Канешне, ніхто не жадае, каб вайскоўцы браліся за зброю. Крый, як кажуць, Божа.

Было прынята рашэнне аб стварэнні міністэрства па справах абароны. Яно і зоймецца ваеннай палітыкай.

Мікалай ГАЛКО.

Нам стало известно

ВОПРОСЫ ВОКРУГ ДОМА ПОЛИТПРОСА!

Хотя вопрос об имуществе КПБ еще не решен, многие организации, учреждения не прочь были бы справить «новоселье» в бывших парткабинетах.

Так, например, на имя Председателя Верховного Совета Беларуси поступило заявление от республиканской Координационной рады национальных объединений о предоставлении ей половины здания бывшего Дома политпросвещения обкома КПБ в Минске для создания Центра национальных культур Беларуси. К тому же, учитывая, что на возрождение национальных культур республиканский бюджет средств не выделяет, рада просит передать помещение бесплатно.

Кстати, в начале октября концепция Центра национальных культур была обсуждена и поддержана на расширенном заседании комиссии Верховного Совета республики по национальной политике.

Анатолий ВИКТОРОВ.

ПРОСВЕТИЛИ ФИЛАРМОНИЮ

ИЖЕВСК. **Два лучших здания, ранее принадлежавших КПСС, обрели новых хозяев, сообщает «Урал-акцепт».**

Девятиэтажный дом республиканского комитета партии отошел Верховному Совету Республики Удмуртия, а бывший Дом политпросвещения — местной филармонии.

Экспресс-прогноз

Почем фунт «деревянных»?

Закрытие западной границы несколько приостановило падение рубля в Беларуси.

В последние дни октября — начале ноября в Бресте и Минске доллар «шел» по 45—50 рублей (для сравнения: в Москве 60—65). Валюта, постоянно участвовавшая в коммерческих операциях между Польшей и Беларусью, оставалась в республике. Впрочем, не долго. Эпидемия всеобщего бегства от советских дензнаков, получившая новый толчок после октябрьского заявления Ельцина об «освобождении» цен, уже наводняет республику рублевой массой из Балтии, России и с Кавказа. Во второй половине месяца курс доллара на наших «черных» рынках практически сравнивается со средним по Союзу. Примерно тогда же возможен кризис в коммерческой торговле, поскольку из-за падения курса рубля (40% за полмесяца) сделки «рубли — валюта — товар — рубли —валюта» станут просто неэффективными.

К примеру, чтобы окупить простенькие джинсы, купленные в Польше за 10 долларов, здесь их нужно будет умудриться продать более чем за тысячу — это две среднемесячные зарплаты.

Владислав ПЛАТУН.

Ад шчырага сэрца

Бывайце здаровы, жывіце багата!

ЗАЎТРА — ДЗЕНЬ ПРАЦАЎНІКОЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ



Што праўда, то праўда: не вельмі хілілася дзяржава да селяніна. Хіба толькі на словах. А на справе — адны здзекі.

Вось і дайшлі да таго, што ў вёску савецкая студэнцкая моладзь едзе з такім настроем, нібы некалі дваране-«дзекабрысты» ў Сібір. Холадна, галадна, беднавата.

На большасці перапрацоўваючых сельгаспрадукцыю прадпрыемствах таксама жыццё не цукар. Пра іх існаванне нават газеты ўспамінаюць некалькі разоў на год. Які ж тут «прэстыж»? Ды яшчэ на фоне саржавелага абсталявання, бруду, вечных «недапаставак», дэфіцытаў і г. д.

ХАЦЯ чаго гэта я так засумаваў? Не ўсё ж так дрэнна! Ёсць, ёсць у нас гаспадаркі-«маякі» і больш-менш дагледжаныя перапрацоўчыя прадпрыемствы. Ёсць і вёскі, з якіх чалавека ў горад і кіем не выгнаць. Ёсць і гаспадарскі парадак, асабліва ў раёнах Заходняй Беларусі, куды Савецкая ўлада, дзякуй Богу, прыйшла ўжо пасля часоў «сплошной» калектывізацыі і 37 года.

Жывуць тут людзі, і някепска: і на грамадскай гаспадарцы «казла» не забіваюць, і на асабістым падворку рукам спакою не даюць. Бо і абуць-апрануць гарадскіх ужо дзетак-унукаў трэба, і сумкі ладныя салам-мясам напхаць. Палова Беларусі на гэтых сумках зараз трымаецца.

І, даю веры, пратрымаецца яшчэ доўга, нягледзячы на цяжкі наш сённяшні час. Каб толькі зноў не знайшоўся на самым версе ўлады які-небудзь занадта ідэйны бальшавічок ды не прыказаў сагнаць у адну агульную клуню ўсіх асабістых курэй. А то ж нядаўна, у жніўні, зноў налякалі людзей танкамі ды стрэльбамі. Хоць ты зноў было рэж скацінку, бы той дзед Шчукар, каб не сагналі з двара ласыя на чужое.

Ну, ды будзем спадзявацца, што такога больш не паўторыцца. Бо хоць баіцца яшчэ многага вёска, але патроху становіцца іншай. Жыве цяжка, але выпростваецца духам. Можа, таму, што зноў з'явілася тут вымушана хаваная ад улад Вера. І таму быццам памаладзелі вёскі — куды ні заедзеш, амаль усюды стаяць на крыжовых дарогах крыжы з вышытымі ручнікамі, зноў спрабуюць свой непаўторны напеўны голас царкоўныя званы, новымі фарбамі зіхацяць капліцы і божыя храмы.

Такое адраджэнне не можа не радаваць. «Бог стварыў вёску, а чалавек — горад». Амерыканская народная прымаўка, але гаворыць яна пра ўсю нашу невялікую планету. Нам, значыць, падыходзіць таксама: бо дзе прырода, зямля — там і Бог. Непарыўная гэтая сувязь.

НАМАЛЯВАЎ я не вельмі святочны малюнак вясковага жыцця-быцця. Ну, калі што якое — дык прабачце. З добрага ж жадання гэтая самотнасць — сёння пасумуем, каб у наступны год нам было весялей. І кожнаму мужыку, і кожнай сялянцы, і кожнай вёсачцы, і кожнай хатцы. Бо праз сум, здаецца, больш дойдзе да нашай улады і ўрада, што жыццё і праца з зямлі і на зямлі — справа і цяжкая, і неабходная. І калі ўжо вялікай дапамогі з сённяшняй дзяржаўнай беднасці чакаць не прыходзіцца, то хаця б не перашкаджалі вёсцы жыць так, як ёй таго самой хочацца.

Са святам вас, даражэнькія! Бывайце ж здаровы і жывіце багата! А наш парламент і ўрад няхай у гэтым, чым могуць, вам дапамогуць. Бо хто ж дзе бачыў багатую краіну без багатай і здаровай вёскі?!

Павел СТАСЕВІЧ, аглядальнік «Народнай газеты» па аграрных пытаннях.

Взгляд

Как завоевать друзей... и как не нажить врагов

Орган Верховного Совета Армении газета «Республика Армения» опубликовала в среду комментарий к Договору между Республикой Беларусь и Азербайджанской Республикой. «Что бы это значило?»—задается вопросом армянская газета. Что бы это значило?—пытаюсь разобраться в положениях Договора я сам.

СТАТЬЯ 6. «Стороны признают и уважают территориальную целостность Республики Беларусь и Азербайджанской Республики».

СТАТЬЯ 17. «...Настоящий Договор не направлен против третьих сторон».

(Из Договора между Республикой Беларусь и Азербайджанской Республикой).

То, что в двусторонних договорах и соглашениях наше спасение и единственный шанс поддержать на плаву республиканскую экономику, — истина настолько очевидная, что говорить об этом лишний раз просто не стоит. Взамен развалившейся на наших глазах союзной «вертикали» складывается система горизонтальных связей, способная удержать от распада не только единое экономическое, демократическое, информационное и пр. пространство, но и пространство дружбы и понимания между бывшими субъектами Союза. Республикам, общими усилиями похоронившим унитарный Союз, нет резона вносить разлад в отношения между собой.

А посему подписанный во вторник Договор с Азербайджанской Республикой, как и межправительственное экономическое соглашение, можно только приветствовать. И все же один момент в тексте Договора, мягко говоря, смущает — его 6-я статья, содержание которой приведено выше. То ли текст Договора смастерили в недрах республиканского МИДа и Верховного Совета по обычному шаблону, то ли без должного анализа приняли предложенный азербайджанской стороной вариант. Как бы там ни было, 6-я статья в ее нынешней редакции позволяет думать, что Беларусь не признает существования самой проблемы Нагорного Карабаха, задевающей интересы третьей стороны — Республики Армения. Не хочется верить, что наши политики, следуя экономическим приоритетам, готовы поступиться всеми иными соображениями и что Беларусь тем самым дает Азербайджану своеобразный карт-бланш в решении спорных с Арменией территориальных вопросов. А может, и вправду следует трактовать текст Договора как свидетельство «азербайджанской ориентации» Беларуси в кавказском регионе?

Налицо неразрешимые противоречия между статьями 6-й и 17-й данного Договора. Выходит, что за спиной Армении решается судьба Нагорного Карабаха. В духе сепаратной сделки. Нашим политикам и дипломатам, как видно, следовало бы вести себя несколько поосмотрительнее там, где задеваются интересы третьей, тоже нам дружественной стороны. Тем более не все можно в этом конкретном случае объяснить недостатком внешнеполитического опыта. Попраны азбучные истины дипломатии, в которой форма всегда играет далеко не последнюю роль. Как говорили в старину, там каждое слово должно быть на крюк подвешено. Тем паче что проблему Нагорного Карабаха признает в принципе и сам Азербайджан, иначе он не сел бы за стол переговоров и не принял бы участие в инициативе Ельцина — Назарбаева. И мы никоим образом не совершили бы посягательство на суверенитет и национальное достоинство нашего азербайджанского партнера, если бы изложили 6-ю статью в не столь категоричной редакции.

Принцип неприкосновенности границ и целостности территорий, на котором строит свою политику суверенная Беларусь, должен облекаться в конкретную форму исходя из конкретных обстоятельств. Дипломатия не терпит шаблонов. Проблему Нагорного Карабаха решать между собой Армении и Азербайджану, любое вмешательство извне может привести лишь к ее обострению — эта истина выше споров. В интересах той же Беларуси занять позицию последовательного нейтралитета и невмешательства, чтобы по неосторожности или через недооценку деликатности и хрупкости этой проблемы не создать ненужной иллюзии о симпатиях к одной из сторон.

Завоевывая на свою сторону друзей, нам никак не следует наживать врагов.

Анатолий МАЙСЕНЯ.

P. S. Официальный представитель МИДа РБ отказался комментировать содержание договора. По его словам, МИД не имел отношения к разработке его положений.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Сумны ракурс

Адзін, зусім адзін?..

Фота Сяргея ПЛЫТКЕВІЧА.

Презентация новой рубрики

О чем говорят в очередях

Такое впечатление, что вся страна стоит теперь в очередях.
Из очередей женщин увозят в родильные дома.
В очередях, случается, умирают ветераны.
В очередях заключаются сделки, совершаются преступные сговоры.
Жизнь — в очередях...
Вместе с вами, уважаемые читатели, стоим в очередях мы — сотрудники «Народной газеты». Стоим за яйцами, морской капустой, пивом... Там и родилась рубрика, которую мы сегодня открываем.
В этих разговорах, как вы сами видите и слышите, очень много политики. Но такое уж наше время: политизирован, кажется, даже воздух.
Впрочем, любой читатель «Народной газеты» может присылать нам образцы устного народного творчества в очередях. Лучшие из них будут напечатаны. Обещаем.

После августовского путча все высшие московские руководители клялись, что армия наша никогда впредь «не будет воевать против собственного народа». И вот выступает на сессии Верховного Совета вице-президент России генерал-майор авиации Руцкой и требует, чтобы Министерство обороны Союза выделило дивизию для блокады строптивой Чеченской республики. Быстро, однако, забылись августовские клятвы.

***

Дед лет семидесяти рассказывает:

— Когда у Гитлера блицкриг не получился — засели немцы в окопах, блиндажах. И начали их вши заедать. Адольф распорядился: изобрести специальный порошок от этой нечисти. Подумали ученые, покумекали — изобрели такой порошок. Испытали его в Германии — отлично действует. А привезли на Восточный фронт, в Россию, — не берет немецкий порошок русских вшей. Они не дохнут, а, наоборот, еще больше звереют, кусачее становятся...

— Это ты к чему, дед?

— А вот слушаю, как говорят у нас про вывод экономики из кризиса. Одни нацеливаются на южнокорейский вариант, другие — на чилийский, третьи — на польский. Мне же кажется: у всех надо учиться, брать что-то разумное, но вариант все равно должен быть наш, отечественный.

— Дед, напиши об этом Кебичу.

— Я бы написал... А дойдет ли мое письмо до Кебича?

***

— Жора, какой ужас! Что у тебя с физиономией?

— От летающей тарелки.

— Как? Где?

— Спроси у моей Катьки, где она их берет.

***

Продовольственные карточки, которые после войны были, — отоваривались стопроцентно. А теперь дадут талоны — и ничего на них не купишь...

***

Стою недавно в очереди, а один мужчина рассказывает:

«На нижней полке в купе перед сном калякают две проститутки.

— Все тут скупердяями стали. Что теперь дают? Смех... Поедем в Воркуту или Норильск, там полярники за одну ночь сто рублей платят.

Пассажир с верхней полки:

— Слушайте сюда, дамочки. Вы же не забывайте, что там, на Севере, ночь полгода тянется».

Записал Юрий СЕКУНДА.

Резонанс

«Чей» он—ящик с гнилым виноградом?

Безобразия в одном из минских овощных магазинов послужили отправной точкой для читателя Владимира Коржаева. В письме в редакцию «Дайте свободу предпринимателю» («НГ» за 10 октября с. г.) он упрекнул в бездействии органы внутренних дел республики, посоветовав им «перейти к выполнению своего долга».

С читателем не согласен первый заместитель министра внутренних дел республики В. А. Ковалев. Он сообщил редакции, что за девять месяцев этого года сотрудники милиции выявили свыше 3,5 тысячи правонарушений в сфере торговли. За сокрытие товаров от покупателей и реализацию их из подсобных помещений привлечены к уголовной ответственности 327 человек, 422 — за обман, недовесы, обмеры и фальсификацию продуктов. Только по Закону «О защите потребительского рынка Белорусской ССР» за реализацию товаров с нарушениями из подсобных помещений привлечено к административной ответственности 2764 работника торговли и общественного питания.

А кроме того, аппаратами по борьбе с экономической преступностью выявлено 8,5 тысячи преступлений — на 7 процентов больше, чем в прошлом году (в целом же по СССР на 2,4 процента меньше). При практически не меняющейся десятилетиями численности (около 1000 сотрудников) аппараты БЭП выявляют почти в полтора раза больше преступлений, чем 10—15 лет назад, что свидетельствует о серьезно возросшей нагрузке.

И не милицейскими усилиями должен прежде всего наводиться порядок в торговле. Существуют такие институты, как государственная инспекция по качеству товаров, санэпидстанции, подразделения ведомственного контроля. А они-то как раз серьезно недорабатывают в этом направлении. Из указанных ведомств материалы, представляющие оперативный интерес, в органы внутренних дел практически не поступают — подчеркивает первый заместитель министра. А перед органами внутренних дел стоят более важные и серьезные задачи: борьба с коррупцией, со злоупотреблениями и преступностью во внешнеэкономической сфере, финансово-кредитной системе, защита всех форм собственности от преступных посягательств, защита потребительского рынка.

Пісьмы парламенту і ўраду

І нас забываць нельга

Шчыра дзякую за паведамленне ў газеце пра намечаную кампенсацыю вывезеным на работу ў Германію, але ж людзей вывозілі не толькі ў Нямеччыну. У 1943 годзе, 19 жніўня мяне, хлопца 1926 года нараджэння, забралі з сям'і, дзе бацька зусім калека, а я ў бацькоў адзіны. Везлі нас немцы ў закрытых таварных вагонах — поўны састаў з нашага Дзятлаўскага раёна. Апынуліся ў Эстоніі на фасфарытных рудніках, гэта ў 15 кіламетрах ад Таліна. Я рабіў пад зямлёй, пра варункі, можа, гаварыць няварта. Ачышчаны фасфат вазілі ў Талінскі порт і пагружалі на параходы, і ўсім было вядома, што сплаўлялі яго ў Германію. Таму лічу, што такую катэгорыю рабочых, якія працавалі як рабы і многія сталі інвалідамі, забываць нельга.

Аляксей КУЧЭЙКА.
г. Дзятлава.

Где она, справедливость?

В условиях современного дефицита на товары первой необходимости, в условиях повсеместной давки и боя в очередях за их приобретением для многих категорий инвалидов и других групп населения введены льготы. Сюда относятся инвалиды и участники войны, родственники погибших, беременные и кормящие матери, инвалиды труда первой группы и инвалиды труда второй группы с повреждением нижних конечностей и глухонемые.

Но какой мудрец из Совмина Республики Беларусь решил, что инвалидам труда второй нерабочей группы по заболеванию сердца легче стоять в очереди, чем всем прочим? Любому кардиологу и терапевту известно, что вторую нерабочую группу этим больным устанавливают только тогда, когда они уже почти не в силах передвигаться и тем более получать эмоциональные перегрузки.

Как правило — это люди, отработавшие свое на производстве и получившие заболевание в результате физических, психологических и стрессовых перегрузок. Сегодня же они не имеют возможности даже приобрести себе необходимые продукты питания без риска умереть от инфаркта в беснующейся толпе.

Михаил ЛАПИКОВ.
г. Орша.

Не много ли льготников?

На сессии Верховного Совета республики будет рассматриваться закон «О земельном налоге». При принятии этого документа необходимо устранить то социальное неравенство в налогообложении жителей сельской местности, которое существует сейчас.

Например, действующим законодательством предусмотрены льготы для определенной категории населения. Так, освобождаются от уплаты сельхозналога руководители колхозов, совхозов, специалисты, секретари партийных организаций, председатели профсоюзных организаций хозяйств, а также секретари райкомов КПБ. Вся тяжесть налогов ложится на рядовых тружеников: доярок, механизаторов, полеводов. Наверное, сегодня всем известно, что материальное положение руководящих кадров не хуже, чем у их подчиненных. В подавляющем большинстве случаев намного лучше. Только в нашем районе таких около 1300 человек. Нет никакого разумного объяснения такой льготе в нынешней ситуации.

Аналогичной льготой пользуются также работники медицинских учреждений, народного образования. Их материальное положение в настоящее время сравнялось с положением других сельских жителей, и в условиях дефицита госбюджета от этой льготы было бы целесообразным отказаться.

В существующем Законе «О сельхозналоге» есть одно правило, при котором уплачивают сельхозналог пенсионеры по возрасту. Это когда в хозяйстве прописан трудоспособный член семьи. В жизни же часто получается так. Сын или дочь прописаны в доме родителей, а фактически живут и работают совершенно в другом месте. Что скрывать, бывает и так, что нигде не работают, а старикам приходится платить налог на всю катушку из-за своих непутевых детей. Следовало бы освободить от земельного налога все хозяйства, где его глава, жена — пенсионеры.

Леонид ЖУКОВИЧ,
депутат районного Совета народных депутатов, начальник отдела налоговой инспекции по Борисовскому району.

Нам стала вядома

Рынак стукае ў дзверы

...А рынак, можна лічыць, ужо пры нашых дзвярах. Каб не сустрэць яго знянацку, гаспадарнікі Мінскай вобласці робяць пэўныя захады.

Ужо існуе 14 сумесных прадпрыемстваў. Да канца года мяркуецца мець 40. Падрыхтаваны прапановы па развіццю эканамічнага супрацоўніцтва з Германіяй. Адбыліся перагаворы з фірмамі Афганістана, Польшчы.

Акрамя таго, была праведзена інвентарызацыя незавершанага будаўніцтва. У выніку вырашылі закансерваваць 27 аб'ектаў кашторысам амаль 55 мільёнаў рублёў.

Каб падтрымаць беспрацоўных

Па падліках, у Барысаве ў будучым годзе будзе каля дваццаці тысяч беспрацоўных.

Колькасць даволі значная. Каб неяк рашыць праблему занятасці насельніцтва, частка кандыдатаў у беспрацоўныя асвоіць новыя прафесіі. Для тых, хто не зможа гэтага зрабіць, ствараецца спецыяльны фонд дапамогі беспрацоўным. Многія прадпрыемствы горада пералічылі ўжо на яго рахунак грошы. Усяго паступіла каля мільёна рублёў.

Мікола ЖУКОЎСКІ.

Фельетон

Если бы у нас была мафия...

Вот все говорят: мафия, мафия! Даже отдельные депутаты совершенно неоправданно бросают это заморское словечко в лицо отдельным руководящим товарищам. И зря. Если уж говоришь, то надо хотя бы знать предмет разговора. Мы со всей ответственностью утверждаем: нет у нас никакой мафии. Или, как частенько выражаются в нашем парламенте, нету!

Да если бы она была, неужели бы не сумела отстоять своих сотоварищей по спекуляции, которых периодически запросто «заметают» на «Комаровке» стражи порядка, забывающие порой личное оружие «при невыясненных обстоятельствах» и даже в неустановленных местах?

Если бы она была, разве же сдавала бы в «комиссионку» конфискованные вещи по цене, в десять раз ниже рыночной, как делал это, например, милиционер А. Савицкий? Причем неоднократно. Да мафия бы эти джинсы и куртки тут же продала бы в рядом стоящем коммерческом ларьке. А здесь совершенно «желторотые» ребятишки какие-то. Джинсы по 40 рублей сдают... И это милицейская мафия?!

Да если бы мафия была, она бы все свои сделки оформила безукоризненно, ни в одном документике запятой бы лишней не оставила. А здесь вещи, изъятые в доход государства, сдаются в магазин (в данном случае № 5 столичного объединения комиссионных магазинов) по частным паспортам. Да еще без товароведческой экспертизы. Это же, честное слово, детский сад. Ну, какая еще мафия могла до такого додуматься: изъять у спекулянта новую куртку, а взамен сдать старую и поношенную?

Кроме того, мафия деньги ценит, в том числе и в кругах, очень близких к правоохранительным. А здесь уже упоминавшиеся частные сдатчики за своими деньгами даже в магазин не приходят. Задепонированы рубли, выражаясь по-бухгалтерски. Конечно, рублей восемьсот — не Бог весть какие деньги, но все же улика. Мафия таких примитивных следов не оставляет.

Да если бы мафия была, разве распорядилась бы она весьма ценным нынче продуктом так, как бывший заместитель начальника ОБХСС Ленинского РОВД Боровский? Изъяв лично 98 бутылок азербайджанского коньяка у некоего врага нашей экономики, он, вместо того чтобы запустить деньги в оборот (все-таки рублей на 50 каждая бутылка тянет), хранил их неизвестно где. И лишь когда этот напиток привлек внимание осведомленных лиц, предъявил справку о сдаче означенного коньяка на ликеро-водочный завод «на переработку».

Надо полагать, все бутылки сначала открывали, потом сливали в бочку, тщательно перемешивали, опять расфасовывали по бутылкам, закрывали новыми пробками с заводским штампом. Да какая мафия стала бы заниматься таким бредом?! Она уж, в худшем случае, сама бы все выпила.

Если бы мафия была, она хотя бы умела считать и знала элементарные сведения из основных отраслей бизнеса. А что мы видим на строительстве здания Московского РОВД? За год больше тонны гвоздей в заводской упаковке «пришли в негодность», а посему списаны безвозвратно.

Да, мы согласны, что наши отечественные гвозди далеко не мирового уровня. Но не до такой же степени, чтобы рассыпаться в прах. Да еще все сразу. Или более 800 килограммов обоев списано. На оклейку комнат, которых еще нет. Или списано более тонны скипидара на мытье кистей от краски, которой на стройке еще не пахло.

А если еще вспомнить об арифметике, то на стройку списано более 3 тысяч квадратных метров полиэтиленовой пленки.

Да если бы у нас в Минске была мафия, она должна была бы нынешнего начальника столичного Управления внутренних дел оберегать и лелеять. А он даже личного приличного «Вольво» не имеет, не то что виллы на побережье.

Так что совершенно авторитетно заявляем: нет у нас мафии! Нету!

Сергей АНТОНЧИК,
Иван ГЕРАСЮК.

І гэта ўсё пра нас...

СВЕЦКАЕ ЖЫЦЦЁ

ЭСЭ

***

Назіраю за гульнёй майго пяцігадовага сына з дзетсадаўскай сяброўкай Веранічкай.

— У што гуляць будзем? — пытаецца Веранічка.

— У вайнушку, — па-мужчынску рашуча адказвае сын.

Вераніка задумалася, схіліўшы галаву.

— Не, давай лепш «у дом», — катэгарычна пярэчыць яна.

Пакуль мой сын разважае над тым, што значыць гуляць «у дом», дзяўчынка бярэ ініцыятыву ў свае рукі. Рассаджвае па месцах лялькі, пачынае добраўпарадкаваць «пакой». Раптам чужым, недзіцячым голасам, што зрабіўся нейкім іржава-пранізлівым, з вісклівымі інтанацыямі, крычыць на хлопца:

— Ну, ідзі, ідзі на свой футбол. Прыпаўзеш позна ноччу — замкну дзверы, у хату не пушчу...

Сын адразу засумаваў. А дзяўчынка, відаць, захапіўшыся гульнёй, не заўважае гэтага, — парасстаўляла цацкі па месцах ды зноў пранізліва крычыць на ўвесь пакой чужым, «дарослым» голасам:

— Ты што, зноў у госці сабраўся? Ну ідзі, ідзі. Прыпаўзеш пад «мухай» — замкну дзверы, у хату не пушчу...

Я часта сустракаю на двары бацькоў дзяўчынкі. Вельмі салідная, ветлівая пара, паважна крочаць яны пад ручку, гжэчна ківаюць суседзям. Здаецца, кожнае слова ў іх на вагу золата... Ну, чым не ідэал сучаснай шчаслівай сям'і, дзе пануюць спакой, павага, разважнасць...

Ківаю ім і я, праўда, заўважаю, што мімаволі ўсміхаюся, калі сустракаюся з імі. Аднойчы падумалася: ці не з такой жа нагоды так шчодра ўсміхаецца нам выхавацелька дзіцячага сада, калі мы штодня прыходзім у сад забіраць сваіх дзяцей? А што? Повадаў для такой усмешкі, думаю, у яе дастаткова...

***

У магазіне, куды я выпадкова зайшла, — мякка кажучы, нешматлюдна. Дзяўчаты-прадаўшчыцы схіліліся над столікам ля касы і нешта падлічваюць на паперцы.

Пустыя прылаўкі, рэдкія наведвальнікі, пыл, што ўрачыста стаіць у паветры, — знаёмая карціна, ці не праўда?

Раптам, амаль як дотык, адчула на сабе чыйсьці пагляд. Жахнуў выраз вачэй старой жанчыны. Яна замерла на паўкроку на самым выхадзе з адзела, непадалёк ад касы, і глядзела на мяне з неверагодным адчаем і мальбой. Такім немым крыкам крычаць людзі ў самыя адчайныя хвіліны свайго жыцця. У чым справа, я не разумела. Чаму гэтая жанчына ўтаропілася ў мяне з такім жахам у вачах? Няўжо яе так уразіла пустэча на магазінных прылаўках ці нястача грошай у кішэнях? Не, справа тут была ў чымсьці іншым. Мне зрабілася несамавіта. Я неяк па інерцыі мінула старую, на імгненне адчула ўсёй істотай напружаную здранцвеласць яе цела. Жанчына, здаецца, баялася варухнуцца, стаяла, прыціскаючы рукі да грудзей, а яе вочы з незразумелай мальбой глядзелі, здаецца, мне проста ў душу.

Мабыць, хацела цішком праскочыць міма касіршы, ды не адважвалася. А тут яшчэ я іду насустрач. Відаць, яна спалохалася, што я магу зразумець яе намер, што я — сведка яе злачынства.

У нашым мікрараёне мне даводзілася бачыць старых — збіральніц бутэлек, старых — збіральніц утылю, ёсць у нас і бабка-пітуха з вечна чырвоным тварам у спушчаных панчохах, што пастаянна мільгае ля гастранома. Калі б я сустрэла гэтых за крадзяжом — не здзівілася б. Але твар гэтай жанчыны, што нібы свяціўся нечалавечай бледнасцю і пранізлівым чалавечым пачуццём, усё стаяў у мяне перад вачыма. Прыгадалася ўсходняя прыпавесць: «Не карайце злодзея, яму дастаткова таго, што ён зрабіў». Толькі цяпер я зразумела яе.

***

Яны ўзнікаюць якраз там, дзе трэба, гэтыя маленькія мікраранскія стыхійныя мікрабазарчыкі: на маленькіх пятачках, пляцоўках, парапетах кветнікаў ля гастраномаў. І што з імі ні рабілі, як ні змагаліся з імі ўлады ў асобе лянівых патрульных міліцыянераў, — як былі яны тут, так і засталіся, пераждыўшы і пільную цікавасць міліцыі, і непагадзь, і няўтульнасць пакупнікоў, канкурэнцыю «лятучых галандцаў» — дзяржаўных латочніц з садавінай-гароднінай, — усё ж выстаялі гэтыя пучкі радыскі, цыбулі, жменькі гароху, горкі яблык, слоікі капусты і місы грыбоў і — галоўнае — раскошныя сукведці півоняў, астраў, гваздзікоў і розных-усякіх безназоўных ды не менш прыгожых кветак, што цудоўнымі фарбамі расквечваюць шэрыя брудныя парапеты пыльных гарадскіх перасохлых газонаў.

Калі я назірала за гэтымі бясконцымі штодзённымі дбаннямі гэтых бабулек, дзядоў, жанчын, а часам і маладых хлопцаў, мне не раз прыходзіла ў галаву думка: а ці акупяцца гэтыя доўгія гадзіны сядзення перад магазінам у любое надвор'е, гэтая доўгая дарога з дому — і назад — прададзенай міскай грыбоў ці жменькай агрэсту?

Аднойчы мне ўдалося разгадаць таямніцу, можна сказаць, запаветны сэнс гэтых гарадскіх мікрабазарчыкаў. Прынамсі, здаецца, што ўдалося... з дапамогай місы гароху.

Захацелася мне аднойчы купіць якой-небудзь зеляніны да абеду на мікрабазарчыку. Убачыла на парапеце місу з зялёным гарохам. Спыталася ў бабулі, што сядзела побач: «Колькі каштуе?» А яна мне ў адказ: «Не ведаю, не маё. Гаспадар недзе адышоўся». Я агледзелася вакол. Побач з гандлярамі садавінай-гароднінай выстраіліся жанчыны-кветачніцы з вёдрамі, поўнымі кветак. Ля адной, немаладой, але яшчэ прыгожай жанчыны-кветачніцы ўвіхаўся жвавы і яшчэ не надта стары мужчына. Ён і так, і гэтак да кветачніцы, і жэстам, і мімікай дапамагаў сабе, расказваў нешта смешнае. Мне, канешне, трохі няёмка адрываць чалавека па дробязях ад яго цікавага занятку, але, што рабіць, спыталася: «Ці не ваш то гарох?» «Не», — адмахнуўся мужчына, нават як след не глянуўшы ў мой бок.

«Не ваш гарох?» — спыталася ў жанчыны, што сядзіць па другі бок ад місы. «Не», — паціскае плячыма жанчына.

А цяпер вось я стаю на гэтым вулічным мікрабазарчыку, аглядаюся вакол, мне проста цікава, ці знойдзецца ўрэшце гаспадар бездагляднай маёмасці. Назіраю і слухаю гаману:

«А што Наталлі Уладзіміраўны даўно не відаць?..»

«Здаецца, да яе сваякі прыехалі».

«А на Ніне новая сукенка. Глядзі, якая ганарыстая. Ёй здаецца, што на яе ўсе глядзяць...»

«...Мы з ім доўга не маглі знайсці агульнай мовы...»

«...А гэтая ўсё чакае свайго Пятровіча...»

«...Лепшы сродак ад рэўматызму...»

Раптам памяць падказала мне, што ўсё гэта я ўжо недзе бачыла, чула. Так, суполка немаладых людзей. Яе агульныя законы... Я ўжо гэта аднойчы бачыла ў старым французскім фільме. Шырокая светлая веранда кавярні. Тут звычайна збіраюцца за кілішкам-напарсткам лікёру пажылыя самотныя людзі. З дня ў дзень вядуць яны тут сваё «свецкае жыццё». Дзеці даўно выраслі, пакінулі іх, на старасць засталася толькі невялікая рэнта ці пенсія. Ды вось яшчэ сябры па кавярні, з якімі можна бавіць час, — яны ратуюць ад самоты, няўтульнасці, пачуцця ўласнай непатрэбнасці.

Акуратненькія, завітыя, элегантныя бабулькі, дзядкі пры гальштуках гамоняць увесь доўгі вечар за гэтым кілішкам:

«...А што Анет сёння не відаць? Летась яна тут, на гэтым месцы, сядзела...».

«...Здаецца, да яе радня прыехала...»

«...У мадам Жафрэ новая сукенка... Глядзіце, колькі фанабэрыі. Ёй здаецца, што на яе ўсе глядзяць».

«Мы з ім так і не змаглі зразумець адно аднаго...»

«...А гэтая ўсё чакае свайго П'ера...»

«Лепшы сродак ад падагры...»

А на нашым мікрабазарчыку заканчваўся дзень. Вось тыя дзве маленькія бабулькі — адна з пучком морквы, другая са жменькай шчаўя — відаць, так і пойдуць са сваёй гароднінай дадому. Хаця, можа, у апошні момант усё ж прададуць яе якому прахожаму за чыста сімвалічную капейку. Затое — пасядзелі дзень з людзьмі, пагаманілі, пабачылі старых знаёмых, пазнаёміліся з новымі. Ды і тая, хай чыста сімвалічная капейка — усё ж не лішняя да нішчымнай пенсіі.

...А гаспадара місы з гарохам я так і не дачакалася. Відаць, у бурлівай віхуры «свецкага жыцця» ён забыўся на гэтую дробязь...

Любоў ФІЛІМОНАВА,
пісьменніца.

Разрешите уточнить

ОКТЯБРЬСКИЙ ПЕРЕВЕРТЫШ

В «Народной газете» за 24 октября сего года за подписью Игоря Сидорука была опубликована заметка «Зато работать не мешают...»

В ней речь шла о том, что журналисты брестской областной газеты «Заря» 23 октября закрыли дверь перед носом своих добрых соседей — малого предприятия «ДиК». В заметке вольно или невольно все перевернуто с ног на голову.

По поручению коллег позволю себе изложить суть дела, опираясь на факты, а не на игру слов «коммунист — демократ».

В начале года, когда со всей остротой встал вопрос о грядущем бумажном голоде, издательство Брестского обкома КПБ заключило договор с малым предприятием «ДиК», суть которого в следующем: МП «ДиК» арендует четыре комнаты в здании, где расположена редакция, за это продает по госцене издательству сто тонн бумаги в 1991 году. Бумага должна была быть поставлена к 1 августа. К указанному сроку поступила лишь треть. Директор малого предприятия мотивировал задержку неразворотливостью поставщиков, и «заревцы» решили подождать до октября.

А в октябре редактору газеты П. Сутько было заявлено, что, раз деятельность КПСС приостановлена, «ДиК» пока не намерен выполнять свои обязательства по договору. То есть как раз та мотивировка, которую Игорь Сидорук приписал журналистам «Зари».

Потом был еще один документ, где директор МП Д. Подшибякин говорил уже не о политических причинах непоставки бумаги, а о том, что, мол, нет правопреемника собственности издательства, некому ту бумагу получать, некому платить по счетам.

После этого, естественно, было решено расторгнуть договор. Между принятием решения и фактическим выселением прошло более двух недель. И все это время, как ни в чем не бывало, работало малое предприятие на себя, напрочь забыв о договоре.

Вот почему закрылась всегда открытая дверь «Зари». И закрылась она только для работников малого предприятия «ДиК». Нет, не очень они мешали нам работать, но и не помогли, как обещали, скрепив обещание печатями и подписями. Так было дело.

Теперь «диковцы» пытаются придать этой истории политическую окраску, как-то связать ее с августовскими событиями. Нелепость это. Налицо — явная коммерческая несостоятельность, просто непорядочность.

Как тут не вспомнить сказанное кем-то на днях: у западных предпринимателей умонастроение цивилизованно-западное, у наших — криминальное.

Иван ОРЛОВ.
г. Брест.

Рэпліка

Пракансультуйце і нас, спадар Бараўцоў!

13 лістапада 1991 г. у «Народнай газеце» была надрукавана рэпліка загадчыка юрыдычнага аддзела Кіраўніцтва спраў Савета Міністраў Беларусі В. Бараўцова, у якой ён спрабаваў абгрунтаваць законнасць пазачарговага выдзялення кватэры сакратару ЦК КПБ Зеляноўскаму. Прычым ён прапанаваў народным дэпутатам Беларусі звяртацца да яго за юрыдычнымі кансультацыямі.

Карыстаючыся гэтай нагодай, хацеў бы спытаць у спадара Бараўцова праз «Народную газету» наступнае: ці маю я права калі-небудзь атрымаць дадатковую жыллёвую плошчу (зараз жыву з сям'ёю з трох чалавек у двухпакаёвай кватэры, жылая плошча якой 29,5 м²), будучы народным дэпутатам Беларусі, кандыдатам гістарычных навук і намеснікам старшыні Цэнтральнай Рады Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады — партыі, якая, у адрозненне ад КПБ, афіцыйна зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі рэспублікі? Тым больш што некаторыя члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі жывуць яшчэ ў горшых умовах, будучы кандыдатамі навук і стоячы шмат год у чарзе на пашырэнне жылплошчы.

Алег ТРУСАЎ,
народны дэпутат Рэспублікі Беларусь.

Народная газета

ЗАРУБЕЖЬЕ ● «Народная газета» ● ТАСС ●

Шпионаж через нейтральные воды

Деятельность разведывательных спецслужб недавно опять оказалась в центре внимания средств массовой информации стран Северной Европы. Однако на сей раз сенсационные разоблачения касаются не козней могущественных ЦРУ и КГБ, а тайных операций военной разведки нейтральной Швеции. Об этом рассказала своим читателям со ссылкой на осведомленное шведское радио ведущая финская газета «Хельсингин саномат». Согласно информации, полученной сотрудниками радио, шведы уже с 60-х годов начали вести разведывательную работу против СССР с территории... дружественной Советскому Союзу нейтральной Финляндии. Центром шпионажа являлось здание шведского посольства в Хельсинки. Оно расположено по соседству с дворцом президента Суоми. Это самая южная часть города, и отсюда открывается вид на Финский залив, за которым всего в 90 километрах Таллинн и северное побережье Эстонии. С помощью мощных антенн, установленных на крыше посольского здания, на протяжении по крайней мере 25 последних лет производился перехват радиопереговоров на территории Ленинградского и Прибалтийского военных округов. Из посольства в Хельсинки перехват информации осуществлять значительно проще, чем со шведских станций прослушивания, расположенных вдоль западного побережья Балтийского моря. Представители охранной полиции Финляндии, МИДа страны и министерства обороны отказываются комментировать это сообщение. В то же время заместитель генерального секретаря финского парламента Сеппо Тиитинен, занимавший в 1978—1990 годах пост шефа охранной полиции, считает журналистскую версию безосновательной.

Александр КОДИНЦЕВ, Рудольф ХИЛТУНЕН.

Хельсинки.

«Военку»— на свалку!

Сокращение военных расходов США осложняет процесс оздоровления американской экономики, которая до сих пор не может выйти из полосы спада. Об этом заявил министр обороны США Ричард Чейни на встрече с журналистами в Сан-Диего (штат Калифорния).

Достанут бомбу «из кармана». Ядерную

Французская телекомпания «Антенн-2» показала материал, свидетельствующий о том, что Ирак, если бы не разразилась война в зоне Персидского залива, имел бы к концу текущего года атомную бомбу. По сведениям «Антенн-2», над ее созданием работали более 15 тыс. специалистов.

Поможем, но равномерно

За равномерное распределение между западными странами финансового бремени, связанного с оказанием помощи государствам Центральной и Восточной Европы, высказался министр иностранных дел ФРГ Ганс-Дитрих Геншер. Речь идет не о том, чтобы мы давали меньше, а о том, чтобы другие давали больше и чтобы тем самым значительно возрос общий объем помощи, заявил он в интервью частной телекомпании РТЛ-Плюс.

...«Надо «убрать» Норьегу»

Медельинский кокаиновый картель Колумбии в 1984 году обратился к международному террористу Карлосу «Шакалу» Санчесу с просьбой организовать убийство «верховного правителя» Панамы, генерала Мануэля Антонио Норьегу. Об этом заявил на проходящем в Майами (штат Флорида) суде над Норьегой Сезар Кура, колумбийский фермер, член «Семьи», входящей в картель Медельин. Почти каждую неделю на процессе всплывают имена или факты, превращающие его в почти готовую основу для сценария захватывающего кинодетектива или супербоевика в стиле форсайтовского «Дня шакала» или бондовских киносюжетов.

Закрой глаза, Господи!

Католические епископы США объявили на своем ежегодном собрании о начале кампании против показа в кино и на телевидении сцен насилия и секса. «Широко рекламируемые на экране сцены ужасов, насилия и секса,— указывает «Ньюсдей», — являются одной из причин растущей в стране детской преступности и сексуальной распущенности».

«Синтетические мозги» — делают деньги...

Япония и ряд других индустриальных стран Запада планируют с начала 1992 года реализацию крупного международного проекта по созданию интеллектуальной производственной системы (ИПС), которая будет автоматически контролировать весь процесс производства — от проектирования до распределения готовых изделий потребителям. Об этом объявили представители японского министерства внешней торговли и промышленности (МВТП).

Надежды оказались тщетными

Попытки властей поставить надежный кордон на пути проникновения во Вьетнам зарубежной табачной продукции оказались неудачными, несмотря даже на то, что за последний год здесь конфисковано свыше 15 млн. пачек сигарет. При этом надо учитывать, что количество выявленных случаев незаконной контрабанды составляет всего лишь 7 проц. по сравнению с общим объемом ее ввоза в республику.

Растем...

Население Берлина возрастет к 2010 году с 3,4 миллиона человек до 4 или даже до 5 миллионов. Ожидаемый прирост «скорее всего произойдет исключительно благодаря иммигрантам». К такому выводу пришли специалисты Берлинского демографического общества.

Фотоглобус

Бахрейн — государство, расположенное на 33 островах в Персидском заливе. Общая территория страны не превышает размеров Москвы.

Сосуд для кофе своеобразной формы украшает многие площади Манамы, столицы государства. Этим напитком бахрейнцы угощают гостя в первую очередь.

Фото В. ЩЕННИКОВА.

Імёны і даты

«Мы да гэтай зямлі прыраслі душою»

109-ю гадавіну з дня нараджэння Якуба Коласа адзначыла Беларусь. У Мінску прайшла навуковая канферэнцыя. Перад ёю ўдзельнікамі выступіў фальклорны ансамбль «Валачобнікі» Мінскага інстытута культуры. Нямала свята прысвячалася ў запаведным кутку рэспублікі — на радзіме народнага песняра.

Госці наведалі філіялы музея Якуба Коласа «Акінчыцы», «Альбуць» і «Смольня», азнаёміліся з мемарыяльна-мастацкай кампазіцыяй «Шлях Коласа», усклалі кветкі да помніка ў вёсцы Мікалаеўшчына.

У Доме культуры вёскі Стары Свержань адбыўся святочны вечар. Адкрыў яго загадчык аддзела культуры выканкама Стаўбцоўскага раённага Савета народных дэпутатаў А. В. Гракаў. Затым слова ўзяў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Васіль Зуёнак.

— Мы да гэтай зямлі, можна смела сказаць, прыраслі душою і лічым сябе тут амаль як дома, — заявіў прамоўца. — Сёння, калі мы тут зноў сустрэліся, мы думаем пра адраджэнне нашай беларускай зямлі, пра адраджэнне беларускай душы, роднай мовы, якая ўсё неяк так згортваецца і згортваецца... Мы не павінны гэтага дапусціць!

На вечары выступілі старэйшы беларускі паэт Сяргей Грахоўскі, народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль, паэты Алесь Разанаў, Язэп Хвалей і Леанід Дранько-Майсюк, крытык Аляксей Пяткевіч. Ад Літаратурнага музея Якуба Коласа слова трымалі старшы навуковы супрацоўнік, унук народнага песняра Даніла Міцкевіч і дырэктар Зінаіда Камароўская.

